
БРЭСЦКАЯ ВОБЛАСЦЬ (/BE/GEO/17) 1822

“А навошта нам?” У Івацэвічах выбаркам адмовіў мясцоваму сайту ў інфармацыі пра даходы кандыдатаў у дэпутаты

06.02.2018 Крыніца: Служба маніторынгу ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў"

Сюжэт: Доступ да інфармацыі (/be/content/dostup-da-infarmacyi-0)

Як даведалася Служба маніторынгу ГА “Беларуская асацыяцыя журналістаў”, рэдакцыя сайта “Першы Рэгіён” вырашыла задаволіць цікавасць выбаршчыкаў і праінфармаваць іх аб даходах кандыдатаў у дэпутаты Івацэвіцкага райсавета.



Аднак сакратар раённай выбарчай камісіі **Алена Лакішык** паведаміла, што гэтыя звесткі можна будзе даведацца на стэндах на ўчастках для галасавання.

“Ёсць пастанова Цэнтрвыбаркама, паводля якога камісія сама вызначае, дзе — у газеце альбо на стэндах — будзе размешчаная гэтая інфармацыя”, — патлумачыла прадстаўніца выбаркама. З яе словаў вынікала, што звесткі пра даходы і маёмасць кандыдатаў не будуць надрукаваныя нават у дзяржаўнай раённай газеце.

Калі журналіст “Першага Рэгіёна” спрабаваў запярэчыць, што законам не забаронена прадстаўленне гэтай інфармацыі ў СМІ, адказ Алены Лакішык быў наступны: “А навошта нам? Камісія на пасяджэнні вырашыла ўсё зрабіць паводле пастановы Цэнтрвыбаркама”.

Рэдакцыя сайта накіравала пісьмовы запыт на адрас Івацэвіцкай раённай выбарчай камісіі. У лісце рэдакцыя спаслалася на адпаведныя артыкулы Канстытуцыі, Закона РБ “Аб сродках масавай інфармацыі” і Выбарчага кодэкса і прасіла выбаркам усё ж даць звесткі пра даходы і маёмасць кандыдатаў у дэпутаты ў Івацэвіцкі раённы савет.

Адказ прыйшоў хутка. Старшыня раённага выбаркама Уладзімір Бурдзь у пісьмовым выглядзе паведаміў наступнае: “У адпаведнасці з Пастановай Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў ад 2017/12/12 № 49 інфармаванне выбарцаў пра агульную суму гадавога даходу і пра маёмасць кандыдата ў дэпутаты ажыццяўляецца акруговай, тэрытарыяльнай выбарчай камісіяй. Спосаб інфармавання — апублікаванне ў друкаваным сродку масавай інфармацыі або размяшчэнне ў агульным плакаце з біяграфічнымі дадзенымі кандыдатаў у дэпутаты — вызначаецца рашэннем камісіі”.

Далей у лісце паведамляецца, што выбарчая камісія ў Івацэвічах вырашыла абмежавацца размяшчэннем гэтай інфармацыі на стэндах непасрэдна на участках для галасавання.

У рэдакцыі сайта “Першы Рэгіён” лічаць, што такім чынам парушаюцца правы не толькі журналістаў, але і выбаршчыкаў.

“Атрымліваецца дзіўная сітуацыя: орган, які тэарэтычна зацікаўлены ў максімальным распаўсюдзе звестак пра выбары, гэтую інфармацыю імкнецца не распаўсюджваць”, — кажа журналіст сайта **Павел Кляўчэня**.

Паводле яго высноваў, гэта адбываецца таму, што кандыдатамі ў дэпутаты Івацэвіцкага райсавета балатуюцца, галоўным чынам, кіраўнікі мясцовых прадпрыемстваў і чыноўнікі. І яны не хачуць, каб грамадскасць ведала пра іх даходы, якія значна перавышаюць заробкі звычайных жыхароў раёна.

Прадстаўнікі “Першага Рэгіёна” кажуць, што маюць намер уласнымі высілкамі сабраць адпаведную інфармацыю з івацэвіцкіх выбарчых участкаў, перапісаць дадзеныя, якія тычацца кандыдатаў і размясціць на сайце. Таксама рэдакцыя інтэрнэт-выдання заклікае сваіх наведнікаў (асабліва ў выбарчых акругах, што знаходзяцца ў вёсках) дзяліцца аналагічнымі звесткамі.

Самыя важныя навіны і матэрыялы ў нашым Тэлеграм-канале — падпісвайцеся! (https://t.me/bajby)

Падпішыся на нашу інфармацыйную рассылку!

Кожны тыдзень атрымлівай на сваю пошту: магчымасці (гранты, вакансіі, конкурсы, стыпендыі), анонсы івэнтаў (лекцыі, дыскусіі, прэзентацыі, прэс-канферэнцыі) і карысны кантэнт.

(/be/node/33)

Найбольш чытанае

Коллеги в тюрьмах. Напишите им письмо поддержки АКТУАЛЬНЫЕ АДРЕСА (/be/content/kollegi-v-tyurmah-napishite-im-pismo-podderzhki-aktualnye-adresa)

МОСТ+: праграма мабільнасці для мэтавых кантактаў паміж людзьмі (/be/content/most-pragrama-mabilnasci-dlya-metavyh-kantaktau-pamizh-lyudzmi)

Два вялікія журналісцкія івэнты 7-8 верасня ў Вільні — РЭГІСТРАЦЫЯ (/be/content/dva-vyalikiya-zhurnalisckiya-iventy-7-8-verasnya-u-vilni-registracyya)

«Забрали детство». На свободе белорусских политзаключенных ждут сотни сыновей и дочерей. У некоторых из них в тюрьме сидят оба родителя (/be/analytics/zabrali-detstvo-na-svobode-belorusskih-politzaklyuchennyh-zhdut-sotni-synovey-i-docherey-u)

Сюжэты (/stories)

COVID-19 (/be/content/covid-19)

23.5 КаАП (/be/content/235-kaap)

Рэгуляванне Байнэту (/be/content/regulyavanne-baynetu-0)


Распаўсюд СМІ (/be/content/raspausyud-smi)

Аўтарскія калонкі (/blogs)

Анна Ефременко: белорусского языка в моей жизни за пределами стерильных рамок уроков не было вовсе (/be/content/anna-efremenko-belorusskogo-yazyka-v-moey-zhizni-za-predelami-sterilnyh-ramok-urokov-ne-bylo)

Спецпраекты

(/analytics/27)



(/be/analytics/priglashaem-zhurnalistov-v-ekspediciyu-po-verhnedvinskomu-rayonu-do-5-iyunya)

Приглашаем журналистов в экспедицию по Верхнедвинскому району (до 5 июня)! (/be/analytics/priglashaem-zhurnalistov-v-ekspediciyu-po-verhnedvinskomu-rayonu-do-5-iyunya)

Важнае



(/be/analytics/shto-matyvue-udzelnichac-u-bazhnym-zhycci-infagrafika)

Што матывуе ўдзельнічаць у “БАЖным” жыцці? (Інфаграфіка) (/be/analytics/shto-matyvue-udzelnichac-u-bazhnym-zhycci-infagrafika)



(/be/content/freedom-house-belarus-u-dzyasyatcy-naygorshyh-krain-pa-svabodze-slova)

Freedom House: Беларусь – у дзясятцы найгоршых краін па свабодзе слова (/be/content/freedom-house-belarus-u-dzyasyatcy-

naygorshyh-krain-pa-svabodze-slova)



(/be/analytics/zakratavany-yubiley-pra-gonar-byc-syabram-i-kalegam-andreya-alyaksandrava)

Закратаваны юбілей. Пра гонар быць сябрам і калегам Андрэя Аляксандрава (/be/analytics/zakratavany-yubiley-pra-gonar-byc-syabram-i-kalegam-andreya-alyaksandrava)

*Беларуская асацыяцыя журналістаў

Copyright © 2008-2023 Беларуская асацыяцыя журналістаў

Мы не размяшчаем рэкламу.

e-mail: press@baj.by (mailto:press@baj.by)
Рэдакцыйная палітыка сайта (/be/editorial_policy)

